**ВЯРХОЎНЫ СУД**
**Рэспублікі Беларусь**

вул. Леніна, 28, 220030, г. Мінск
тэл. (017) 226-12-06, факс (017) 227-12-25
E-mail: scjustrb@pmrb.gov.by

**ВЕРХОВНЫЙ СУД**
**Республики Беларусь**

ул. Ленина, 28, 220030, г. Минск
тел. (017) 226-12-06, факс (017) 227-12-25
E-mail: scjustrb@pmrb.gov.by

21.05.2008 № 03н-598

На № ________ ад ____________

Стэфановічу Валянціну Канстанцінавічу
вул.Даўгабродская, д.5-1, кв.19
г.Мінск

Лабковічу Уладзіміру Мікалаевічу
вул.Маякоўскага, д.20, кв.40
г.Мінск

Бяляцкаму Аляксандру Віктаравічу
пр.Незалежнасці, д.78А, кв.48
г.Мінск

Вярхоўным Судом Рэспублікі Беларусь ваша скарга разгледжана.

Рашэннем Вярхоўнага Суда ад 26 кастрычніка 2007 г. адмоўлена ў задавальненні скаргі на рашэнне Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі Грамадскага праваабарончага аб'яднання "Вясна".

У скарзе просіце прынесці пратэст на рашэнне Вярхоўнага Суда як неабгрунтаванае і незаконнае.

Скарга задавальненню не падлягае па наступных абставінах.

У адпаведнасці з ч.6 арт.12 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях" назва грамадскага аб'яднання абавязана адрозніваца ад назваў іншых грамадскіх аб'яднанняў, загэгістраваных у Рэспубліцы Беларусь, або ліквідаваных па рашэнню суда.

З матэрыялаў справы відаць, што 23 ліпеня 2007 г. у Міністэрства юстыцыі былі пададзены дакументы аб дзяржаўнай рэгістрацыі Грамадскага праваабарончага аб'яднання "Вясна". Аднак, рашэннем Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 28 кастрычніка 2003 г. было ліквідавана Грамадскае аб'яднанне "Праваабарончы цэнтр "Вясна".

Паколькі назва створанага грамадскага аб'яднання, по сутнасці, супадае з назвай раней ліквідаванага грамадскага аб'яднання, што з'яўляецца недапушчальным, вывад суда аб парушэнні вышэйназванага артыкула Закона "Аб грамадскіх аб'яднаннях" пры стварэнні новага аб'яднання, абгрунтаваны.

Той факт, што пры рэгістрацыі аб'яднаннем не прадстаўлены дакументы аб аплаце дзяржаўнай пошліны, што таксама з'явілася падставай для адмовы ў рэгістрацыі і ў задавальненні скаргі, пацверджаны прадстаўленым платежным дакументам аб аплаце рэгістрацыйнага збору (без указання, за што праведзены дадзены плацеж).

Аплата рэгістрацыйнага збору не аднолькава з аплатай дзяржаўнай пошліны і не адпавядае патрабаванням Закону “Аб грамадскіх аб’яднаннях”.

Такім чынам, Вярхоўны Суд законна і абгрунтавана прызнаў правільнай адмову Міністэрства юстыцыі ў рэгістрацыі грамадскага аб’яднання.

Довады скаргі аб тым, што рэгістрыруючы орган адмаўляе ў рэгістрацыі толькі ў тым выпадку, калі не выканана прапанова аб змене назвы або не папраўлены іншыя недахопы, не заснаваны на законе.

Адтэрміноўка дзяржаўнай рэгістрацыі ў адпаведнасці з арт.15 Закона “Аб грамадскіх аб’яднаннях” з’яўляецца правам, а не абавязкам рэгістрацыйнага органа.

З улікам зазначанага, падстаў для прынясення пратэсту на судовае рашэнне не маецца.

Дадатак на 3 л. – у апошні адрас

Намеснік Старшыні
Вярхоўнага Суда
Рэспублікі Беларусь

В.М.Вышкевіч